ложить их за икону, хранить весь год. Считалось, что тогда и молния, и беда обойдут дом стороной.

Обрядность и поэзия вождения стрелы на территории Ветковского района сохраняется и сегодня, что подтверждается материалами, записанными в полевых экспедициях. Представленные варианты этого обряда в сборниках, архивные материалы раскрывают богатство локальных особенностей этого самобытного обрядового явления.

**Список литературы**

1 Савельева, Н. «Стрела»: обряд и песни / Н. Савельева // Цень стралы: культурныя і вербальныя коды традыцыі / пад рэд. Р. Кавалёвай, В. Калацэя. – Мінск: ІВЦ Мінфіна, 2018. – 190 с.

2 Новак, В. С. Абраднасць і паэзія «пахавання стралы» / В. С. Новак / нав. рэдактар І. Ф. Штэйнер. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2002. – 269 с.

*УДК 398.86(476.2-37Добруш)*

**Л. А. Масанавец**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

## ПРЫПЕЎКІ Ў ПЕСЕННЫМ РЭПЕРТУАРЫ ЖЫХАРОЎ ДОБРУШСКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*У артыкуле асэнсоўваюцца прыпеўкі на аснове аўтэнтычнага фальклорнага матэрыялу, запісанага ад жыхароў Добрушскага раёна. Аўтарам зроблена класіфікацыя прыпевак дадзенай мясцовасці, вызначаны іх тэматычная разнастайнасць, асноўныя матывы, а таксама ўвага скіравана на сродкі мастацкай выразнасці.*

У сістэме фальклорных жанраў беларусаў важнае месца адводзіцца прыпеўкам. Як адзначыла Г. А. Пятроўская, «гэта своеасаблівы летапіс гісторыі, хроніка чалавечых жыццяў і лёсаў, імгненны рэзанатар пачуццяў і псіхалагічных станаў чалавека» [1, с. 351 – 352]. «Прыпеўка – аднастрофная лірычная песенька самага разнастайнага зместу, якая складаецца з чатырох, радзей шасці радкоў па пэўнаму музычнаму ўзору і выконваецца часам як прыпеў да танца» [2, с. 5]. Гэта па-ранейшаму адзін з запатрабаваных песнятворных фальклорных жанраў беларускага народа, бо пазаабрадавыя песні па-мастэрску перадаюць адценні эмацыянальнага пачуцця выканаўцы,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

стану яго душы ў той ці іншы момант выканання. Тым самым прыпеўкі «ствараюць даволі глыбокае ўражанне, даюць вялікай абагульняючай сілы вобраз. З асобных рысак, яркіх, дакладных, складваецца пэўная экспрэсіўна-псіхалагічная карціна» [2, с. 5]. У артыкуле выкарыстаны матэрыялы навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі пры кафедры рускай і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны».

Звычайна прыпеўкі падяляюцца на некалькі груп, якія нанізваюцца адна на другую і ўтвараюць быццам бы самастойныя сюжэтныя лініі. У сувязі з гэтым можна вылучыць наступныя групы частушак па іх тэматычнай скіраванасці: сацыяльныя, гумарыстычныя, сямейныя, любоўныя, любоўна-эратычныя, а таксама прыпеўкі, прымеркаваныя да танцаў.

Калі ж разглядаць вышэйназваныя групы, то, напрыклад, сярод любоўных прыпевак жыхароў Добрушскага раёна можна назваць пэўныя тэксты, прысвечаныя асобным лірычным героям. Для дадзенага песеннага жанру такога тыпу характэрны выразны жартаўлівы характар:

*Палюбіла лецэнанта,*
*А мая мне гаварыць,*
*Ён у міра, як пасыльны,*
*Можна і тапачкі пашыць* (запісана ў в. Карма Добрушскага раёна ад Хацковай Ганны Рыгораўны, 1931 г. н.).

У прыведзеным тэксце прыпеўкі ўвага надаецца асобе няўдалага жаніха-лейтэнанта, у якога нічога няма і які вымушаны вандраваць па свеце, выконваючы ролю «пасыльнага», за што і быў раскрытыкаваны сяброўкай лірычнай гераіні. Сама ж закаханая доўга не сумавала і, як можна даведацца далей, у хуткім часе звярнула ўвагу на іншых маладых людзей, кожны раз па-новаму перажываючы пачуццё кахання:

*Палюбіла лецэнанта,*
*А патом палітрука,*
*І ўсё вышэй, вышэй, вышэй,*
*Дабралась да пастуха* (запісана ў в. Карма Добрушскага раёна ад Хацковай Ганны Рыгораўны, 1931 г. н.).

Як можна заўважыць, у цэнтры ўвагі гераіні знаходзіцца палітрук, а пасля, як бы іранічна гэта ні гучала, яна закахалася ў пастуха, які выказаў сваю незадаволенасць яе захопленасцю лейтэнантам:

*Палюбіла лецэнанта,*
*А пастух ругаецца:*
*– У мяне тожэ на баку*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Сумка целюпаецца* (запісана ў в. Карма Добрушскага раёна ад Хацковай Ганны Рыгораўны, 1931 г. н.)

Адметнасцю трэцяй кампазіцыйнай часткі прыпеўкі з’яўляецца наяўнасць непрыхаванага і невыкрывальнага кпіна пастуха з лейтэнанта, што з’яўляецца лагічным ў сюжэце прыпеўкі, каб станоўча паўплываць на настрой слухачоў.

У чацвёртай і заключнай частцы прыведзенай прыпеўкі гаворыцца аб тым, што жанчына, хутчэй за ўсё, прыслухалася да парад сяброўкі і пастуха, выбраўшы адзінае выйсце з сітуацыі, што склалася, – застацца ў адзіноце, расчараваўшыся ў сваіх надзеях на шчаслівае каханне:

*Светачка радзімая,*
*Свяча негасімая,*
*Гарэла ды растаяла,*
*Любіла ды аставіла* (запісана ў в. Карма Добрушскага раёна ад Хацковай Ганны Рыгораўны, 1931 г. н.).

Варта адзначыць яшчэ і той факт, што вялікую ўвагу ў прыпеўках надаюць таксама і ролі гарманіста, бо менавіта ад яго залежалі настрой на свяце, імкненне спяваць частушкі пра каханне, сярод якіх можна вылучыць наступную:

*Я палола буракі*
*Пад зялёным дубам,*
*Палюбіла гарманіста*
*З кучаравым чубам.* (запісана ў в. Івакі Добрушскага раёна ад Несцяровіч Анастасіі Цітаўны, 1922 г. н.)

У гэтай прыпеўцы ўсхваляецца асоба гарманіста, асабліва яго знешні выгляд, а таксама раскрываюцца пачуцці дзяўчыны да яго, чаго, напрыклад, не скажаш пра наступную прыпеўку. У ёй ужо бачна недасягальнасць мары дзяўчыны выйсці замуж за яго з прычыны недастатковай матэрыяльнай забяспечанасці сям’і:

*Гарманіста я любіла,*
*Не папала за яго:*
*Не хваціла капітала*
*У папашы маяго* (запісана ў в. Івакі Добрушскага раёна ад Несцяровіч Анастасіі Цітаўны, 1922 г. н.).

Заслугоўвае ўвагі, як вынікае са зместу папярэдняй прыпеўкі, прысвечанай асобе гарманіста, сам цэнтральны вобраз (гарманіст), які можа быць таксама раскрытыкаваны жанчынай альбо другімі асобамі, што і можна назіраць у наступным выпадку:

*Ой, які гарманіст,*
*Такое і гранне:*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Паймаў бабу за трусы*

*І дзяржаў да рання* (запісана ў в. Івакі Добрушскага раёна ад Несцяровіч Анастасіі Цітаўны, 1922 г. н.).

Такая не зусім маральна-этычная канцоўка сведчыць аб тым, што якім бы заможным і цнатлівым ні быў чалавек, але ўсё роўна ён можа паддацца граху. Такім жа парушэннем паводзін чалавека з'яўляецца і алкагалізм. У сувязі з гэтым можна вылучыць такую тэматычную групу прыпевак асобна. Да месца адзначыць, што праблема алкагалізму сярод мужчынскай паловы вясковага насельніцтва была надзвычай вострай:

*Вы, рэбята, вы, рэбята,*
*Самі сябе губіце,*
*Вы за чарку самагонкі*
*І казу палюбіце* (запісана ў в. Івакі Добрушскага раёна ад Гарбачовай Надзеі Іванаўны, 1928 г. н.)

Гэтая прыпеўка з'яўляецца доказам бессэнсоўнасці і неабдуманасці тых дзеянняў, на якія здольны чалавек пад уздзеяннем спіртных напояў, але ж і на жыццёвым шляху такіх людзей таксама сутракаюцца закаханыя:

*Меня маменька браніла,*
*Што я п'яніцу любіла,*
*А я маменьке ў атвет,*
*Што цвярозых ныне нет* (запісана ў в. Івакі Добрушскага раёна ад Гарбачовай Надзеі Іванаўны, 1928 г. н.).

Вось тут і выяўляецца асаблівая сіла кахання, пад уздзеяннем якога не заўважаюцца ніякія негатыўныя рысы каханага чалавека, хоць і ўказваюць на іх многія людзі. Таксама нельга адмаўляць і тое, што ў жанчыны проста можа і не быць дастойнага прэтэндэнта на ролю будучага мужа і іншы раз ёй прыходзіцца выбіраць сабе пару з тых, хто рэальна ёсць:

*Выйшлі з хаты пастаяць* -
*Два падкідыша ляжаць:*
*Аднаму дык сорак восем,*
*А другому пяцьдзесят* (запісана ў в. Івакі Добрушскага раёна ад Гарбачовай Надзеі Іванаўны 1928 г. н.).

У апошняй прыпеўцы надзённа гучыць праблема безальтэрнатыўнасці і адсутнасці выхаду з сітуацыі, што склалася, калі няма магчымасці па-сапраўднаму пакахаць чалавека, у якім гарманічна паяднаны і знешняя прыгажосць, і багаты ўнутраны свет.

Такім чынам, падсумоўваючы вынікі, можна сцвярджаць, што прыпеўкі жыхароў Добрушскага раёна з'яўляюцца разнастайнымі па



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

тэматыцы і праблематыцы. Па сутнасці, як сведчаць самі тэксты, прыпеўкі – гэта той малы фальклорны жанр, які закранае ўсе сферы жыцця, чуйна рэагуе на розныя праявы ў ім, станоўчыя і негатыўныя, выразна і эмацыянальна, дакладна і псіхалагічна глыбока перадае пачуцці чалавека.

**Спіс літаратуры**

1 Прыпеўкі / уклад. тэкстаў, уступ. арт. і камент. І. К. Цішчанкі; муз. частка Л. М. Фёдарава; рэдкал.: А. С. Фядосік (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 432 с.

2 Беларусы. Т. 7: Вусная паэтычная творчасць / Г. А. Барташэвіч, Т. В. Валодзіна, А. І. Гурскі і інш.; рэдкал.: В. М. Белявіна і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Бел. навука, 2004. – 586 с.

*УДК 398.33:398.432(476.2)*

**Д. А. Несцярэнка**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

## АБРАД ВАДЖЭННЯ РУСАЛКІ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ФАЛЬКЛОРУ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ)

*У артыкуле, падрыхтаваным на аснове аўтэнтычных запісаў пра русальны абрад, зробленых студэнтамі і выкладчыкамі ГДУ імя Ф. Скарыны, прыведзены цікавыя прыклады абрадавых дзеянняў і песень, звязаных з міфалагічным персанажам – русалкай. Аўтарам прааналізаваны асаблівасці бытавання гэтай абрадавай з'явы на тэрыторыі Добрушскага раёна, вылучаны адметныя рысы выканання абраду ў асобных вёсках.*

Абрад ваджэння русалкі – адзін з самых цікавых веснавых абрадаў, звесткі пра які былі запісаны студэнтамі і выкладчыкамі УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф.Скарыны» на працягу шматлікіх гадоў у палявых экспедыцыях на тэрыторыі розных раёнаў Гомельскай вобласці і апублікаваны ў кнізе Валянціны Новак «На гранай нядзелі русалкі сядзелі» [1]. Засяродзім увагу на мясцовых асаблівасцях гэтага абраду, які выконвалі ў Добрушскім раёне Гомельскай вобласці. Варта адзначыць, што звесткі, запісаныя пра ваджэнне русалкі ў вёсках Баршчоўка, Кругавец-Калініна, Леніна, Насовічы, Перарост, Чырвоная Буда, Чырвоны Партызан, Усохская



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ